**Important Bird Area:** Dzivin - Vialiki Lies






© Volker Blueml

**Code:** BY050

**Central coordinates:** 52° 04' N 24° 34' E

**Location:** Brestskaya voblast: Kobryn region

**Area:** 20449 ha

**IBA Criteria:** A1, A4i

**National conservation status:** цэнтральная частка тэррыторыі з’яўляеца біялагічным заказнікам мясцовага значэння «Дзівін – Вялікі Лес» (3851 га)

**International conservation status:** ТВП міжнароднай значнасці, утворана ў 2010 годзе

## Site description:

Тэрыторыя ТВП размешчана ў паўднёва-заходняй частцы Кобрынскага раёна. З усходняга боку прымыкае ТВП "Балота Званец". Размешчана ў паўночна-усходняй частцы Маларыцкай раўніны - аднаго з трох фізіка-геаграфічных раёнаў акругі Брэсцкага Палесся Палескай правінцыі.

Рэльеф пераважна плоскі. Характэрнай асаблівасцю з'яўляюцца затарфованыя лагчыны, арыентаваныя з паўночнага-усходу на паўднёвы-захад.

На тэрыторыі ТВП "Дзівін - Вялікі Лес" праходзіць сістэма каналаў, якія

упадаюць уДняпроўска-Бугскі канал. Самым вялікім з іх з'яўляецца Казацкі канал. Перасякае вялікі балотны лясны масіў з юго-усходу на северо-захад у яго паўднёвай часткі. Праведзеная меліярацыя аказвае істотны ўплыў на водны рэжым лясных тарфяна-балотных глеб. Возера Любань, якое звязана дрэнажнымі каналамі з Дняпроўска-Бугскім каналам, з'яўляецца тут адзіным натуральным вадаёмам. Возера Любань разам з вдсх. Арэхаўскім і некалькімі затопленамі торфапляцоўкамі мае вялікае значэнне для вадаплаўваючых і каляводных птушак.

Забалочаныялясныяўчасткі, а таксама нізінныя балоты прадстаўленыяўцэнтральнайчастцы ТВП.

У адпаведнасці з геабатанічнымраянаваннемтэрыторыяадносіцадаПрыбугска-Прыпяцкаму раёну Бугска-Палескай геабатанічнай акругі падзоны шырокалісцева-хваёвых лясоў. На тэрыторыі біялагічнага заказніка "Дзівін - Вялікі Лес" пераважаюцьбяроза, сасна. Значнае распаўсюджванне атрымалі дуб, ясень,алешыначорная,радзей -грабіклён. Падлесакунасаджэнняхпрадстаўленыўасноўнымкрушынай,вярбой, ляшчынай, свідзінай.

У цэлым флора налічае каля 400 відаўсасудзістых раслін. Па прадстаўленасці такога рэдкага для еўрапейскага кантынента выгляду, як венерын чаравічак сапраўдны Cypripedium calceolus (каля 10 тыс. экзэмпляраў) заказнік "Дзівін - Вялікі Лес" не мае сабе роўных у Рэспубліцы Беларусь.

ТВП "Дзівін - Вялікі Лес" выкарыстоўваецца для вядзення лясной гаспадаркі, палявання, рыбалкі, збору грыбоў і ягад. Меліярыраванныя ўчасткі пераважна выкарыстоўваюцца для выпаса кароў і сенакосаў. На берагах воз. Любань размешчаныя базы адпачынку.

## Habitats:

Драбналістыя лясы - 35,8%, хваёвыя лясы - 7%, шырокалісцевыя лясы - 5%, сельгасугоддзі - 30%, балоты - 12,5 %, штучныя вадаёмы - 7%, азёры - 2,3%.

## Birds:

165 відаў птушак сустракаюцца на разглядаемай мясцовасці, 130 відаў гняздзіцца.

Тэрыторыя ТВП мае вялікае значэнне для захавання рэдкіх відаў птушак. Тут

яшчэ захаваліся месцы пасялення такіх відаў як вялікі арлец *Aquila clanga*, вяртлявая чаротаўка *Acrocephalus paludicola*, вялікі грычук *Limosa limosa*.Мясцовая папуляцыя цецерука адна з самых буйных на крайнім паўднёвым захадзе Беларусі. Увосень перад міграцыяй на меліяраваных землях адзначаюцца зграі шэрых жураўлёў колькасцю да 3 000 асобін. У цэлым 58 відаў птушак маюць розны Еўрапейскі ахоўны статус.

## Other animal groups:

На ТВП адзначана 36 відаў звяроў, 5 відаў рэптылій, 10 відаў амфібій.

## Populations of IBA trigger species:

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Pintail *Anas acuta* | P | 50-100 oc | 2000-2009 | Good | | |
| Smew *Mergus albellus* | P | 20-40 oc | 2000-2009 | Good | | |
| Black-throated diver *Gavia arctica* | P | 0-5 oc | 2000-2010 | Good | | |
| Bittern *Botaurus stellaris* | B | 5 males only | 2000-2009 | Good | ↔ | |
| Great white egret *Casmerodius albus* | B | 5-15 breeding pairs | 2005-2010 | Medium | ↑ | |
| Black stork *Ciconia nigra* | B | 4-10 breeding pairs | 2000-2009 | Medium | ↔ | |
| White-tailed eagle *Haliaeetus albicilla* | N | 3-4 oc | 2000-2009 | Poor | ↔ | |
| Short-toed eagle *Circaetus gallicus* | B? | 1-3 breeding pairs | 2000-2009 | Medium | ↔ | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Hen harrier *Circus cyaneus* | B | 2-4 breeding pairs | 2000-2009 | Medium | | |
| Lesser spotted eagle *Aquila pomarina* | B | + | 2000-2009 | Poor | | |
| Spotted eagle *Aquila clanga* | B? | 0-1 breeding pairs | 2000-2009 | Good | ↔ | |
| Hobby *Falco subbuteo* | P | + | 2000-2009 | Poor | | |
| Little crake *Porzana parva* | B | 20-30 males only | 2000-2009 | Medium | ↑ | |
| Corncrake *Crex crex* | B | 25-30 males only | 2000-2009 | Medium | ↓ | |
| Crane *Grus grus* | B | 20-30 breeding pairs | 2000-2009 | Medium | ↔ | |
| Crane *Grus grus* | P | 1500-3000 individuals | 2000-2009 | Good | ↔ | A4i |
| Black-tailed godwit *Limosa limosa* | B | 10-20 breeding pairs | 2000-2009 | Good | ↓ | A1 |
| Eagle owl *Bubo bubo* | B | 3-4 breeding pairs | 2000-2009 | Good | ↔ | |
| Green woodpecker *Picus viridis* | B | 2-5 breeding pairs | 2000-2009 | Poor | | |
| White-backed woodpecker *Dendrocopos leucotos* | B | 5-10 breeding pairs | 2000-2009 | Poor | | |

| Species | Season | Quality of estimate | Period | Quality of estimate | Trends | IBA criteria |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Aquatic warbler *Acrocephalus paludicola* | B | 11-15 | 2009 | Good | ↔ | A1 |
| Bearded reedling *Panurus biarmicus* | B | > 1 breeding pairs | 2009 | Poor | | |
| Azure tit *Cyanistes cyanus* | N | + | 2000-2009 | Poor | | |

## Other biodiversity:

Звяры: Барсук Melesmeles, арэшнікавая соня Muscardinusavellanarius.

Рэптыліі: Балотная чарапаха *Emysorbicularis.*

Насякомые: Гламерыс звязаны *Glomerisconnexa,* мнемазіна *Parnassius mnemosyne,* жужаль фіялетавы *Carabusviolaceus*.

Расліны: Пылкагалоўнік чырвоны *Cephalantherarubra,* ятрышнік мужчынскі *Orchis mascula*, увярэднік скіпетрападобны *Pedicularissceptrum-carolinum,* венерын чаравічак сапраўдны *Cypripediumcalceolus,* кадзіла сармацкае *Melittissarmatica,* ядрушка даўгарогая *Gymnadeniaconopsea,* гарычка крыжападобная *Gentianacruciata* , гайнік цёмна-чырвоны *Epipactisatrorubens,* вярба чарнічная *Salixmyrtilloides,* асака ценявая *Carexumbrosa,* званочак шыракалісты *Campanulalatifolia,* зубніца клубняносная *Dentariabulbifera,* лілея кучаравая *Liliummartagon,* тайнік яйцападобны *Listeraovata,* касач сібірскі *Irissibirica.*

## Threats:

- зарастанне асаковых балот хмызняком.
- значная рэкрыяцыйная нагрузка.

## Recommendations for the conservation:

- Падтрымліваць гідралагічны рэжым заказніку з дапамогай шлюзаў на канале Казацкі.

- Перадаць пад ахову месцы абітання рэдкіх відаў.
- Абмежаваць палявання на прамысловыя віды птушак на тэрыторыі заказніка.
- Інфармаванне мясцовага насельніцтва аб ТВП.

## References:


Асабістыя паведамленні: Бакур Ю.Ю., Кальчанка А.І., Левы С.В., Пракапчук В.

Научное и технико-экономическое обоснование местного биологического заказника «Дивин-Великий лес» в Кобринском районе Брестской области.



**Authors :** Бакур Ю.Ю., Кальчанка А.І., Левы С.В.


---


* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*